ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 11 (606) | Субота, 6 красавіка 1985 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

**Пазаўчора ў актавай зале адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Амеркавана пытанне «Аб рабоце дэканата, партыйнага бюро фізічнага факультэта па падбору, расстаноўцы і выхаванню кадраў і іх ролі ва ўдасканальванні вучэбна-выхаваўчага працэсу». З дакладам выступіў дэкан фізічнага факультэта дацэнт У. М. Старыкаў. У спрэчках прынялі ўдзел загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, член парткома Ф. М. Харытановіч, старшыня прафкома студэнтаў Н. І. Колтышава, прарэктар па завочнаму навучанню Л. Н. Сечка, загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі У. М. Семянчук, в. а. рэктара Л. А. Шамяткоў, аспірант, член парткома А. М. Кусянкоў, сакратар парткома М. І. Старавойтаў.**

**Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.**

**На сходзе заслухана інфармацыя намесніка сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце Г. Д. Ветлугаева аб ходзе выканання пастановы агульнаўніверсітэцкага партыйнага сходу ад 23 снежня 1983 г. «Аб партыйным кіраўніцтве грамадскімі арганізацыямі». У інфармацыі адзначана, што ўсе пункты прынятай тады па гэтаму пытанню пастановы ў асноўным выкананы.**

*Палітычны залік*

## ДОБРАЯ ПРАВЕРКА

На эканомфаку, як і на іншых факультэтах універсітэта, з 18 па 30 сакавіка праходзіў палітычны залік. Мэта яго — пашырэнне палітычнага кругагляду студэнтаў.

Палітычны залік здалі ўсе камсамольцы эканамічнага факультэта з адзнакамі «добра» і «здавальняюча», якія будуць выстаўлены ў заліковыя кніжкі студэнтаў. Залік прымалі камісіі, у якія ўвайшлі выкладчыкі, куратары груп, члены камітэта камсамола факультэта. У асноўным яны з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю аднесліся да сваіх абавязкаў. Аднак былі і недахопы: у некаторых групах залік без абгрунтаваных прычын пераносіўся на іншыя дні, не з'яўляліся на залік некаторыя выкладчыкі — члены камісіі.

Вынікі субяседвання на палітзаліку засведчылі, што большасць студэнтаў актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці свайго факультэта і універсітэта, ведае важнейшыя дакументы Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, матэрыялы з'ездаў ВЛКСМ і ЛКСМБ, разбіраюцца ў пытаннях міжнароднага жыцця, унутранай і знешняй палітыкі КПСС, знаёмы з гісторыяй міжнароднага маладзёжнага і фестывальнага руху, правільна арыентуюцца ў палітычнай карце свету.

На жаль, ёсць яшчэ і такія студэнты, якія абыякава адносяцца да сваіх грамадскіх даручэнняў, лічаць гэтую работу непатрэбнай, не прымаюць удзел у патрыятычным руху — студэнцкіх будаўнічых атрадах, не павышаюць свой культурны ўзровень, жывуць абмежаваным у духоўных адносінах жыццём. Усё гэта — недапушчальна для студэнта вышэйшай навучальнай установы.

Таму куратары, члены камітэта камсамола павінны ўдзяляць больш увагі арганізацыі грамадскіх мерапрыемстваў у акадэмічных групах, каб студэнты жылі цікавым, напоўненым сэнсам жыццём.

Палітычны залік з'явіўся добрай праверкай спраў камсамольцаў, выявіў недахопы і дапамог знайсці шляхі іх ухілення.

**І. НЕШЫК,**
**студэнтка 3-га курса эканамічнага факультэта, старшыня прэс-цэнтра.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканаты і кафедры віншуюць загадчыка кафедры ўсеагульнай гісторыі ЛАЗЬКО Рыгора Рыгоравіча, загадчыка кафедры тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі МАЛІНКОЎСКАГА Юрыя Уладзіміравіча і ЛАЗАРАВА Ігара Сяргеевіча з кафедры геафізікі з выпадку прысваення ім ВАКам вучонага звання дацэнт.**

*ЗАЎТРА — ДЗЕНЬ ГЕОЛАГА*

## У ГЛЫБІНЯХ НЕТРАЎ

Мы ЖЫВЕМ у эпоху, калі адносіны чалавека да прыродных рэсурсаў прыкметна мяняюцца. Мінуў час адкрыцця месцанараджэнняў карысных выкапняў без вялікіх затрат, на паверхні. Цяпер патрэбны новыя метады. Даводзіцца ўсё глыбей пранікаць у зямную кару. Нафтавікі, напрыклад, ужо асвоілі глыбіні на 3—4 км. Глыбінёй да трох кіламетраў (Індыя) ёсць і шахты.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад удзяляюць вялікую ўвагу геалагічным даследаванням. Так XXIII з'езд КПСС паставіў перад геолагамі задачу расшырыць навуковыя работы па вывучэнню зямной кары, XXIV — вызначыць заканамернасці размяшчэння карысных выкапняў. На XXV з'ездзе партыі зроблен вывад, што трэба вывучаць не толькі зямную кару, але і мантыю, якая знаходзіцца на глыбінях ад 30 да 35 км. XXVI з'езд КПСС нацэліў геолагаў на далейшае вывучэнне саставу і эвалюцыі Зямлі. Размова ідзе не аб абстрактным даследаванні, а аб аддачы ў выглядзе новых буйных месцанараджэнняў мінеральнай сыравіны.

Істотнай праблемай з'яўляецца ахова геалагічнага асяроддзя, таму што ў сучасную эпоху чалавек становіцца сілай, якая ўжо не ўступае тэктанічным і вулканічным працэсам. Сучасныя кар'еры, напрыклад, гэта сапраўдныя «шрамы» на «целе» Зямлі. Яны дасягаюць глыбіні 300 і больш метраў. На кар'ерных палях Курскай магнітнай анамаліі адзначаецца нават змяненне гравітацыйнага поля. Усё больш непакоіць пытанне, куды дзяваць «пустую» пароду, якая штогод у велізарнай колькасці накапліваецца ў адвалах. Мы ж не збіраемся ператварыць рэльеф Зямлі ў месячны ландшафт. Адсюль праблема выкарыстання гэтых «пустых» парод і неабходнасць рэкультывацыі зямель.

У сэнсе аховы геалагічнага асяроддзя вельмі важнымі з'яўляюцца ашчадныя адносіны да глебы. Яе выкарыстоўваемая плошча няўхільна памяншаецца. Цяпер 7 працэнтаў сушы на Зямлі занята інжынернымі збудаваннямі, а працягласць чыгунак і шасейных дарог у свеце перавышае адлегласць ад Зямлі да Месяца.

Апошняе дзесяцігоддзе азнаменавалася значнымі геалагічнымі адкрыццямі дзякуючы свідраванню ў акіяне, у тых месцах, дзе таўшчыня вады перавышае некалькі кіламетраў, і на сушы, у прыватнасці, на Кольскім паўвостраве. Кольская звышглыбокая свідравіна дасягае 13 км глыбіні. Гэта самая глыбокая свідравіна ў свеце. Яе працягваюць свідраваць. У бліжэйшай будучыні такіх свідравін на тэрыторыі СССР будзе 10—15.

Аэракасмічныя даследаванні, глыбокае свідраванне і геафізічныя даследаванні прывядуць праз некалькі гадоў да новых адкрыццяў, да новага разумення геалагічных працэсаў. І сёння, віншуючы вопытных маладых і яшчэ зусім юных геолагаў з іх прафесіянальным святам, — Днём геолага — можна з упэўненасцю сказаць, што не толькі цяперашняе, але і будучае пакаленне людзей нашай краіны поўнасцю забяспечаць сябе ўсімі неабходнымі карыснымі выкапнямі — вадой, нафтай, газам, вугалем, рудамі чорных і каляровых металаў.

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.**

## ГАНАРЫМСЯ ВЫПУСКНІКАМІ

Геалагічны факультэт нашага універсітэта існуе амаль 16 гадоў. За гэты час ім падрыхтавана звыш 800 маладых спецыялістаў. Цяпер яны працуюць у самых аддаленых кутках нашай неабсяжнай Радзімы: на Камчатцы — У. Яўсеенка, на Сахаліне — М. Абарынаў і У. Браткоў, на Чукотцы — Ю. Крукоўскі і В. Кавалёва, у Краснаярску — А. Котаў і В. Лапашына, у Архангельску — М. Мотыраў, у Тарка-Сале муж і жонка Ю. і В. Няроўныя, а таксама М. Захараў, у Нар'ян-Мары — М. Ермакоў, у Адэсе — Т. Казлова, у Кызыле — П. Макараў, у Валгаградзе — муж і жонка У. і Н. Нябесныя і г. д.

Найбольшая колькасць выпускнікоў факультэта працуе ў вытворчых і навукова-даследчых арганізацыях Беларусі. Многія з іх уносяць значны ўклад у вырашэнне задач, пастаўленых перад савецкім народам партыяй і ўрадам. Вялікая група нашых выпускнікоў удзельнічае ў меліярацыі зямель беларускага Палесся. Так, напрыклад, выпускнік 1975 г. У. Шаўцоў з'яўляецца начальнікам гідрагеолага-меліярацыйнай партыі Палескай экспедыцыі. Тут жа працуюць В. Ермакоў, Н. Шаўцова, В. Ляляўскі, П. Давідзенка і інш.

Пошукамі нафты і газу ў тэматычнай партыі трэста «Белнафтагазразведка» заняты кіраўнік групы масавых пошукаў В. Міхалёў, кіраўнік тэматычнай групы У. Усаў, інжынер групы выпрабавання В. Вахненка, інжынерныя работнікі А. Азаранка, С. Рабоўскі, Б. Куценеў.

Многія з выпускнікоў ужо ў студэнцкія гады актыўна займаліся ў навуковых гуртках і сваю працоўную дзейнасць вырашылі прысвяціць геалагічнай навуцы. У навукова-даследчым Інстытуце геахіміі і геафізікі АН БССР цяпер паспяхова працуюць А. Махнач, С. Шалухін, Л. Гуліс, Г. Катонава, у Беларускім навукова-даследчым геолага-разведачным інстытуце — І. Манькін, у трэсце «Заходнафтагеафізіка» — 24 выпускнікі, сярод якіх У. Бубноў, А. Лазоўскі, Б. Дубінін, І. Карпухін, Н. Лаптухова, В. Шуміляк і інш. У аб'яднанні «Беларусьнафта» набытыя на нашым факультэце веды паспяхова прымяняюць А. Гарцаў, У. Бяляеў, А. Марозаў, К. Казлоў, І. Рыбянкова і многія іншыя выпускнікі.



НА ЗДЫМКУ: Кольская звышглыбокая свідравіна. Фота выпускніка геалагічнага факультэта ГДУ В. І. Марчагова. На другім плане каля лініі электраперадачы бачна буравая вышка, на якой працуе В. І. Маргачоў.

Атрымаўшы дыпломы аб вышэйшай геалагічнай адукацыі, на факультэце засталіся працаваць лепшыя яго выпускнікі. В. Г. Жогла стаў ужо дацэнтам. Абараніў кандыдацкую дысертацыю і загадчык галіновай навукова-даследчай лабараторыі М. І. Аўтушка. Кандыдатамі геолага-мінералагічных навук з'яўляюцца таксама А. А. Махнач, В. Д. Парошын і некаторыя іншыя былыя выхаванцы геафака.

Ад імя ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта горача віншуем яго выпускнікоў з надыходзячым святам — Днём геолага і жадаем ім добрага здароўя, плённай працы на карысць любімай Радзімы, вялікага асабістага шчасця.

**Ж. ГЕРАСІМАВА,**
**сакратар партбюро геалагічнага факультэта,**
**Ю. ІВАНОЎ,**
**партгрупорг кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.**



# КПСС — НАТХНЯЛЬНІК І АРГАНІЗАТАР ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

БЛІЗКА дзень, калі савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаць знамянальную дату — 40-годдзе перамогі над гітлераўскім фашызмам. Усё далей у гісторыю адыходзіць эпапея Вялікай Айчыннай вайны, самай жорсткай з усіх войн, якую перажыла наша краіна. Час, што аддаляе нас ад Дня Перамогі, дазваляе больш ясна ўбачыць веліч подзвігу савецкага народа.

Вялікім натхняльнікам і арганізатарам, правадыром савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне была ленінская Камуністычная партыя. «Сваёй шматграннай дзейнасцю,— указваецца ў пастанове ЦК КПСС «Аб 40-годдзі Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў», — яна забяспечыла трывалае адзінства палітычнага, дзяржаўнага і ваеннага кіраўніцтва, арміі і народа, фронта і тылу. Па яе закліку ўся краіна ўзнялася на смяротны бой з фашызмам». Кіруючая дзейнасць партыі стала галоўным фактарам, які забяспечыў поспех у барацьбе з фашызмам і мілітарызмам.

У гады Вялікай Айчыннай вайны асабліва яскрава праявіліся такія адметныя рысы палітычнага кіраўніцтва партыі, як глыбокая навуковасць, рэвалюцыйная энергія і мэтанакіраванасць, цвёрдасць і непахіснасць у дасягненні пастаўленых мэт. Вайна прад'явіла асаблівыя патрабаванні да форм і метадаў работы партыі і дзяржавы, патрабавала перабудовы ўсяго жыцця краіны на ваенны лад. Кіруючыся ленінскім указаннем аб тым, што «калі справа дайшла да вайны, то ўсё павінна быць падпарадкавана інтарэсам вайны, усё ўнутранае жыццё краіны павінна быць падпарадкавана вайне, хоць якое-небудзь малейшае ваганне недапушчальна», партыя зрабіла ўсё, каб пераўтварыць краіну ў баявы лагер.

ПРАГРАМА перабудовы жыцця краіны на ваенны лад атрымала адлюстраванне ў дырэктыве Саўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня 1941 года. У ёй указваліся шляхі рашэння галоўных ваенна-палітычных задач у барацьбе з фашызмам, вызначаліся задачы партыйных і савецкіх органаў, выказвалася цвёрдая ўпэўненасць у непазбежнасць разгрому ворага. Распрацаваная партыяй праграма, яе заклік «Усё для фронта! Усё для перамогі!» сталі баявым сцягам барацьбы савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Пераўтварэнне краіны ў адзіны баявы лагер патрабавала рашэння комплексу палітычных, ваенных, эканамічных і ідэалагічных задач у інтарэсах максімальнай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў краіны на разгром ворага. Партыя перабудавала перш за ўсё сваю дзейнасць, формы і метады работы ў адпаведнасці з умовамі ваеннага часу. Узмацніўся арганізацыйны цэнтралізм, пераразмеркаваліся партыйныя сілы, павысілася дысцыпліна, асабістая адказнасць кожнага камуніста за выкананне рашэнняў партыі, уносіліся змены ў структуру партыйных і дзяржаўных органаў. З мэтай умацавання адзінства палітычнага і ваеннага кіраўніцтва краінай і Узброенымі Сіламі ўся паўната ўлады была сканцэнтравана ў руках Дзяржаўнага Камітэта Абароны, на чале якога стаў Генеральны сакратар ЦК ВКП(б), Старшыня Саўнаркома СССР, Народны камісар абароны, Вярхоўны Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі І. В. Сталін. Рашэнні ДКА былі абавязковымі для ўсіх партыйных, савецкіх, ваенных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый. Але гэта ніколькі не падмяняла і не паслабляла кіруючай ролі ЦК ВКП(б) у кіраўніцтве ўзброенай барацьбой. За гады вайны адбылося звыш 200 пасяджэнняў Палітбюро, Аргбюро, Сакратарыята ЦК ВКП(б). Многія пытанні абмяркоўваліся на сумесных пасяджэннях членаў Палітбюро, ДКА і Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

ДЛЯ павышэння ўзроўню партыйнага кіраўніцтва эканомікай краіны з першых жа дзён вайны быў пашыраны інстытут парторгаў ЦК ВКП(б), у транспартных арганізацыях, у саўгасах і МТС дзейнічала сістэма палітаддзелаў. У буйных прамысловых цэнтрах, партыйных камітэтах ствараліся спецыяльныя аддзелы, якія займаліся важнейшымі галінамі абароннай прамысловасці.

Сваёй важнейшай задачай Камуністычная партыя лічыла ўзмацненне партыйнага ўплыву ў войсках, павышэнне ролі і адказнасці паліторганаў і партыйных арганізацый у рашэнні задач, якія стаялі перад Узброенымі Сіламі. У складанай ваеннай абстаноўцы пачатку вайны была ўведзена надзвычайная форма партыйнага кіраўніцтва — інстытут ваенных камісараў, якія сталі носьбітамі рэвалюцыйнага духу ленінскай партыі, яе дысцыпліны, цвёрдасці і мужнасці ў барацьбе з ворагам.

Важнай састаўной часткай узмацнення партыйнага кіраўніцтва стала пераразмеркаванне партыйных сіл. Следуючы ўказанням У. І. Леніна і абапіраючыся на вопыт грамадзянскай вайны, Камуністычная партыя сканцэнтравала свае лепшыя сілы ў Чырвонай Арміі. За гады вайны ва Узброеныя Сілы было накіравана 13 850 кіруючых партыйных работнікаў.

Важнейшым праяўленнем кіруючай ролі Камуністычнай партыі ва Узброеных Сілах з'яўлялася авангардная роля камуністаў. «Камуністы, наперад!» — гэты заклік заўсёды гучаў там, дзе было найбольш цяжка. Амаль тры чвэрці воінаў, удастоеных высокага звання Героя Савецкага Саюза, з'яўляліся камуністамі. Каля двух мільёнаў камуністаў— звыш палавіны прадваеннага саставу ВКП (б) — аддалі свае жыцці ў імя перамогі. Але партыя не аслабела ў барацьбе з ворагам, яна загартоўвалася і мацнела. За гады вайны ў партыю ўступіла звыш 5 мільёнаў чалавек. Прыкметна, што найбольшы прыток воінаў у партыю быў у самыя цяжкія 1941 і 1942 гады. Да канца вайны на фронце знаходзілася звыш трох мільёнаў членаў і кандыдатаў у члены ВКП(б), кожны чацвёрты воін быў камуністам.

ПАЎСЯДЗЕННУЮ ўвагу ўдзяляла партыя кіраўніцтву ўсенароднай барацьбой у тыле ворага. Сотні партыйных работнікаў, тысячы камуністаў і камсамольцаў былі накіраваны на падпольную работу. На часова акупіраванай ворагам тэрыторыі змагаліся 140 тысяч камуністаў, у тым ліку 35 тысяч у Беларусі. У розныя гады ў акупіраваных раёнах краіны дзейнічалі 90 падпольных абкомаў, акружкомаў, міжрайкомаў, 620 гаркомаў і райкомаў партыі. Дзейнасць Камуністычнай партыі па арганізацыі і кіраўніцтву партызанскім рухам увайшла яркай старонкай у гісторыю нашай Радзімы.

Ва ўсёй разнастайнасці задач, якія вырашала партыя ў час Вялікай Айчыннай вайны, асноўнай была ўмацаванне абароны краіны. Толькі за першы тыдзень было мабілізавана звыш 5 мільёнаў чалавек, а усяго за гады вайны ва Узброеныя Сілы было прызвана звыш 20 мільёнаў чалавек, у тым ліку 1.100 тысяч ураджэнцаў Беларусі. Разам з арміяй на ўзброеную барацьбу з захопнікамі партыя ўзняла ўвесь народ. У Маскве, Ленінградзе, Адэсе, Севастопалі, Гомелі, Магілёве і іншых гарадах краіны летам і восенню 1941 года было сфарміравана 60 дывізій і 200 асобных палкоў і атрадаў народнага апалчэння, аб'яднаўшых каля 2 мільёнаў чалавек. У прыфрантавой паласе да канца 1941 года ў барацьбе з дыверсантамі, шпіёнамі дзейнічала 1755 знішчальных батальёнаў колькасцю звыш 328 тысяч чалавек.

ПАРТЫЯ праяўляла пастаянныя клопаты аб узмацненні матэрыяльна-тэхнічнай асначчанасці войск. У 1943 годзе вораг страціў сваю тэхнічную перавагу, а на завяршальным этапе вайны Чырвоная Армія пераўзыходзіла гітлераўскія войскі па танках і самаходных артылерыйскіх устаноўках у 2,8 раза, па гарматах і мінамётах — у 3,2 раза, па баявых самалётах — у 7,4 раза. Разгортванне Узброеных Сіл, хуткі рост іх колькасці патрабавалі ад партыі ўзмоцненай увагі да падрыхтоўкі камандных кадраў. Значна пашырылася сетка ваенных навучальных устаноў, за гады вайны было падрыхтавана каля 2 мільёнаў ваенных спецыялістаў. Да канца вайны Узброеныя Сілы мелі ў сваіх радах 12 Маршалаў Савецкага Саюза, 14 Галоўных маршалаў і маршалаў радоў войск, 2 адміралы флоту і 5597 генералаў і адміралаў. 217 генералаў, ураджэнцаў Беларусі, у час вайны камандавалі воінскімі злучэннямі.

Глыбокім веданнем ваеннай справы, смеласцю аператыўнай думкі, шырынёй стратэгічнага кругагляду савецкія кіруючыя ваенныя кадры намнога пераўзышлі генералітэт фашысцкага вермахта. За гады вайны была праведзена 51 стратэгічная аперацыя, у тым ліку 35 наступальных. У залаты фонд савецкага ваеннага мастацтва ўвайшлі буйныя стратэгічныя аперацыі, 40-годдзе якіх мы адзначылі ў ходзе падрыхтоўкі да галоўнай падзеі — 40-годдзя Вялікай Перамогі. Сталіца Радзімы Масква 347 разоў салютавала доблесным савецкім войскам за перамогі над фашысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй.

НАТХНЁНЫЯ Камуністычнай партыяй воіны Чырвонай Арміі ў баях Вялікай Айчыннай вайны праявілі стойкасць і масавы гераізм. 11633 воіны, прадстаўнікі ўсіх народаў СССР, удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. За подзвігі на фронце звыш 7 мільёнаў чалавек узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Гісторыя не ведае такога масавага гераізму, які праявілі савецкія людзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікая перамога кавалася як на палях бітваў, так і ў савецкім тыле. Фундамент яе быў закладзены яшчэ да вайны, калі былі створаны высокаразвітая індустрыя, сацыялістычная сельская гаспадарка, хутка растучая абаронная прамысловасць. Раптоўнае нападзенне гітлераўскай Германіі патрабавала хуткага пераводу савецкай эканомікі на ваенныя рэйкі. З першых дзён вайны ўсе ніткі кіраўніцтва эканомікай краіны былі сканцэнтраваны ў Цэнтральным Камітэце, яго Палітбюро, ДКА, якія рашалі складанейшыя задачы мабілізацыі людскіх і матэрыяльных рэсурсаў, расшырэння вытворчасці ў абаронных галінах і наладжвання выпуску ваеннай прадукцыі там, дзе яна раней не выраблялася, стварэння рэзерваў для арміі і флоту, падрыхтоўкі кадраў і г. д. Сярод гэтых важных задач першаступеннай стала перабазіраванне прадукцыйных сіл ва ўсходнія раёны краіны.

Маштабы эвакуацыі былі вялізныя. За першае паўгоддзе вайны былі перавезены 1523 буйныя прамысловыя прадпрыемствы, 10 мільёнаў чалавек — па сутнасці, цэлая індустрыяльная дзяржава перамясцілася на сотні і тысячы кіламетраў. Аператыўна і дакладна ажыццяўляўся ўвод у строй эвакуіраваных прадпрыемстваў у самыя кароткія тэрміны, прадукцыю пачыналі выпускаць нярэдка пад адкрытым небам.

ПЕРАБУДОВА народнай гаспадаркі краіны праходзіла ў неверагодна складаных умовах. Першапачатковыя няўдачы на фронце і страты важных у эканамічных адносінах раёнаў цяжка адбіліся на прамысловай вытворчасці. Да канца 1941 года ўзровень яе ўпаў больш чым у 2 разы, а па некаторых відах выраба ў — у дзесяткі і сотні разоў. У выключна неспрыяльных умовах сацыялістычная гаспадарка Савецкага Саюза аказалася здольнай вырашыць самыя складаныя задачы. У вельмі кароткія тэрміны — да сярэдзіны жніўня 1942 года — завяршылася перабудова народнай гаспадаркі на ваенны лад. Галоўным арсеналам Чырвонай Арміі сталі ўсходнія раёны краіны.

Каранныя зрухі ў эканоміцы былі дасягнуты ў выніку вялікай арганізатарскай і ідэйна-выхаваўчай работы Камуністычнай партыі, самаадданай працы савецкіх людзей. Яны праявілі высокую арганізаванасць, настойлівасць і мужнасць, з гонарам неслі працоўную вахту ваеннага часу. Гэтыя выдатныя якасці працаўнікоў тылу, асноўную масу якіх складалі жанчыны, падлеткі, пенсіянеры, асабліва праявіліся ў сацыялістычным спаборніцтве. У першыя дні вайны нарадзіўся лозунг: «Працуй за сябе і за таго, хто пайшоў на фронт!» Восенню 1941 года пачаўся рух камсамольскіх брыгад пад дэвізам: «У працы, як у баі!». У маі 1942 года разгарнулася Усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва Вялікі размах атрымаў рух «двухсотнікаў», «трохсотнікаў», «тысячнікаў» за перавыкананне планавых заданняў у два, тры і нават дзесяць разоў.

На заклік Камуністычнай партыі «Усё для фронта! Усё для перамогі!» адгукнулася калгаснае сялянства. Сацыялістычная сельская гаспадарка пры значных стратах пасяўных плошчаў і пагалоўя жывёлы ў сувязі з акупацыяй вытрымала ўсе цяжкасці вайны. Пры вострым недахопе рабочых рук, сельскагаспадарчых машын працаўнікі вёскі забяспечылі харчаваннем армію і тыл. Малады яшчэ калгасны лад, да пачатку вайны толькі ўступіўшы ў другое дзесяцігоддзе, вытрымаў цяжкія выпрабаванні, паказаў сваю жыццёвую сілу.

Вялікі ўклад у развіццё ваеннай эканомікі ўнесла савецкая навука. На аснове фундаментальных даследаванняў савецкіх вучоных хутка распрацоўваліся і ўдасканальваліся новыя тыпы ўзбраення і боепрыпасаў, артылерыйскіх гармат і мінамётаў, танкаў, самалётаў, караблёў, радыёапаратуры, медыцынскіх прэпаратаў. На працягу вайны лепшымі танкамі былі савецкія, пераўзыходзіла самалёты праціўніка і наша авіяцыя.

Вялікі ўклад ў разгром фашысцкай Германіі ўнеслі працаўнікі тылу. За гады вайны савецкая прамысловасць выпусціла 489,9 тысячы артылерыйскіх гармат, 136,8 тысячы самалётаў, 102,5 тысячы танкаў і самаходных артылерыйскіх установак. Калгасы і саўгасы далі дзяржаве 4,3 мільярды пудоў зерня.

Радзіма высока ацаніла працоўны подзвіг рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі. Толькі медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г.г.» было ўзнагароджана звыш 16 мільёнаў чалавек.

ПЕРАМОГА Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне насіла заканамерны характар. Яна была атрымана савецкім народам ў імя міру і жыцця на Зямлі. І калі сёння наша партыя заклікае памятаць аб мінулай вайне, гэта значыць, што савецкія людзі павінны перш за ўсё змагацца за мір. «Гістарычны вопыт вучыць, — указваецца ў пастанове ЦК КПСС аб 40-годдзі Перамогі, — для таго, каб адстаяць мір, патрэбны згуртаваныя, узгодненыя і актыўныя дзеянні ўсіх міралюбівых сіл супраць агрэсіўнага, авантурыстычнага курса імперыялізму. Неабходна павышаць пільнасць народаў, берагчы і прымнажаць заваёвы сацыялізму».

**В. МАТУСЕВІЧ,**
загадчык кафедры гісторыі КПСС, дацэнт.

# УЗНАГАРОДЫ ДАСТАЮЦЦА ЛЕПШЫМ

На кафедрах грамадскіх навук пачалася актыўная падрыхтоўка да XI Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках і гісторыі міжнароднага маладзёжнага руху. Пэўную работу ў гэтым плане вядзе і калектыў кафедры палітэканоміі. На ўсіх факультэтах адбіраюцца лепшыя рэфераты студэнтаў па палітэканоміі. Іх аўтары пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры збіраюць дадатковыя фактычныя і тэарэтычныя матэрыялы, аналізуюць іх і вынікі даследаванняў выкарыстоўваюць у сваіх навуковых работах. Асабліва актыўна ўдзельнічаюць у студэнцкай рабоце другакурснікі і трэцякурснікі эканамічнага факультэта. 13 студэнтаў спецыяльнасцей «Эканоміка працы» і АМАЭІ прымаюць удзел у даследаваннях па дзяржбюджэтнай тэме кафедры «Гаспадарчы механізм развітога сацыялізму і яго роля ў павышэнні эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў».

Актывізацыі НДРС на кафедры садзейнічае абмен вопытам работы пераможцаў папярэдняга Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках. Перад студэнтамі выступалі лаўрэаты Х Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнт- завочнік 5-га курса спецыяльнасці «Эканоміка працы» І. Есафаў, які атрымаў дыплом 1-й ступені на рэспубліканскім туры, і студэнтка групы Т-51 Л. Белая, якая ўзнагароджана дыпломам 2-й катэгорыі на Усесаюзным туры агляду-конкурсу. (на здымку). Асабліва плённа ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце члены студэнцкага навуковага гуртка пры кафедры палітэканоміі.



**Н. ПУХАВА, дацэнт кафедры палітычнай эканоміі.**

## НА НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

У г. Казані адбылася Усесаюзная навуковая канферэнцыя па выніках Х Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прыняць удзел у якой давялося і мне, як дыпламантцы конкурсу.

На канферэнцыі з дакладам выступіў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Н. І. Мохаў.

Перад пачаткам работы секцый удзельнікі канферэнцыі наведалі музей гісторыі Казанскага дзяржаўнага універсітэта і Ленінскі мемарыял.

На секцыі палітычнай эканоміі былі заслуханы цікавыя даклады аб сацыялістычнай інтэнсіфікацыі вытворчасці, сацыялістычнай дысцыпліне працы, знешнеэканамічных сувязях СССР, барацьбе працоўных ва ўмовах сучаснага манапалістычнага капіталізму і інш.

Адбыўся мітынг удзельнікаў канферэнцыі і студэнцкай моладзі г. Казані «За антыімперыялістычную салідарнасць, мір і дружбу», была арганізавана цікавая культурна праграма.

Дыпламанты Х Усесаюзнага конкурсу былі заахвочаны 10-дзённай паездкай у адну з сацыялістычных краін і па гарадах Савецкага Саюза.

**Лілія БЕЛАЯ, студэнтка 5-га курса эканамічнага факультэта, удзельніца навуковай канферэнцыі ў г. Казані.**

*Да вынікаў рэспубліканскага спаборніцтва*

## ФІЗКУЛЬТУРА—ЗДАРОЎЮ

**Падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва сярод вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі і саветаў ДСТ «Буравеснік» за 1984 год. Сярод ВНУ, якія прызнаны пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую пастаноўку фізкультурна-аздараўленчай і масавай спартыўнай работы, і Гомельскі дзяржаўны універсітэт.**

## КАБ ЗАДАВОЛІЦЬ ПОПЫТ НА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адметнай асаблівасцю геалагічнай будовы Беларусі з'яўляецца магутная таўшчыня чацвярцічных ледніковых адкладанняў, якія закрываюць каранныя пароды, што ўтрымліваюць нафту, калійныя солі, металы. У такіх геалагічных умовах асаблівае значэнне набываюць геафізічныя метады разведкі, таму што фізічныя палі (гравітацыйнае, магнітнае, электрычнае, цеплавое і інш.) пранікаюць на любыя глыбіні і нясуць інфармацыю аб саставе і будове вывучаемых тоўшчаў. У Беларусі працуюць шматлікія геафізічныя арганізацыі, якія вырашаюць разнастайныя задачы — ад пошукаў карысных выкапняў да абгрунтавання будаўніцтва меліярацыйных сістэм і іншых збудаванняў. Беларускія геафізікі вядомы сваёй кваліфікацыяй далёка за межамі рэспублікі, таму іх прыцягваюць да работы вахтавым спосабам у Заходняй Сібіры і Арменіі. У апошні час аб'ём такіх работ пастаянна павялічваецца, і гэта выявіла недахоп геафізікаў з вышэйшай адукацыяй у Беларусі. Трэба сказаць, што ў цэлым па ўсёй краіне не хапае спецыялістаў-геафізікаў.

Для таго, каб зменшыць дэфіцыт спецыялістаў такога профілю ў нашай рэспубліцы, у ГДУ, пачынаючы з 1982 года, вядзецца падрыхтоўка геафізікаў у рамках спецыялізацыі «геафізіка» на фізічным факультэце. Першы паскораны выпуск геафізікаў колькасцю 10 чалавек быў накіраваны ў мінулым годзе на работу ў г. Мазыр у Палескую геафізічную экспедыцыю.

Студэнты-геафізікі вучацца па праграме фізічнага факультэта і атрымліваюць трывалую падрыхтоўку, авалодваюць радыёэлектронікай. Усё гэта вельмі неабходна сучаснаму геафізіку. Акрамя таго, больш 1000 вучэбных гадзін адводзіцца для авалодвання спецыяльнымі геафізічнымі дысцыплінамі. З гэтай мэтай у мінулым годзе была ўтворана новая кафедра — геафізікі, якая аснашчана небходнай апаратурай.

Асаблівае значэнне ў падрыхтоўцы геафізікаў маюць палявыя практыкі. Геафізік жа даследуе прыродныя аб'екты, і навучыцца гэтаму седзячы толькі ў аўдыторыі немагчыма, абавязкова трэба папрацаваць у полі. Таму ўжо пасля 1-га курса студэнты-геафізікі выязджаюць на вучэбную геалагічную практыку. У час яе яны знаёмяцца з геалагічнымі аб'ектамі поўдня Беларусі і поўначы Украіны, вывучаюць сучасныя геалагічныя працэсы. Пасля 2-га і 3-га курсаў праводзяцца вучэбныя геафізічныя практыкі на палігоне ў Чонках. Тут студэнты вучацца працаваць з сучаснай геафізічнай апаратурай, выконваюць палявыя даследаванні. Акрамя спецыяльных ведаў палявыя практыкі даюць студэнтам навыкі нялёгкага палявога жыцця, калектыўнай працы і адказнасці. Пасля 4-га курса студэнты адпраўляюцца ў лепшыя геафізічныя арганізацыі Беларусі на вытворчую практыку.

Аднак падрыхтоўка прыкладна 10 геафізікаў у год у рамках спецыялізацыі на фізічным факультэце не задавальняе патрэбы рэспублікі. Цяпер ёсць заяўкі на 50—60 спецыялістаў у год. Пытанне аб пашырэнні падрыхтоўкі геафізікаў у нашым універсітэце разглядалася ў Мінвузе СССР. Было прынята рашэнне аб адкрыцці новай спецыяльнасці «Геафізічныя метады пошукаў і разведкі месцанараджэнняў карысных выкапняў» на геалагічным факультэце. Цяпер Мінвуз БССР разглядае магчымасці набору 50 студэнтаў па гэтай спецыяльнасці ў 1985 годзе.

**М. МЫЦЫК, дацэнт кафедры геафізікі.**

*ДНІ КАФЕДРЫ*

## КРОКІ ДА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

У інтэрнаце № 4 прайшлі дні кафедры заалогіі і аховы прыроды. Яны адкрыліся сустрэчай студэнтаў біяфака — жыхароў інтэрната — з вядучымі выкладчыкамі кафедры. На ёй кандыдат біялагічных навук В. І. Талкачоў і аўтар гэтай карэспандэнцыі расказалі студэнтам малодшых курсаў аб арганізацыі вучэбнага працэсу і навуковай работы на кафедры заалогіі і аховы прыроды.

Дацэнт І. Ф. Расашка правяла цікавую гутарку аб вучэбна-навукова-вытвор ч ы м аб'яднанні «Фауна Палесся», пазнаёміла з багаццем нашага беларускага краю і з тымі работамі, якія выконваюцца студэнтамі біяфака ў рамках аб'яднання. Расказ Іны Фёдараўны суправаджаўся паказам маляўнічых слайдаў.

З мэтай больш глыбокага знаёмства студэнтаў малодшых курсаў з задачамі экспедыцый, якія праводзіць кафедра, і з удзелам у іх старшакурснікаў, быў праведзены вечар «Давайце пазнаёмімся». На ім выкладчыкі, студэнты імкнуліся паказаць цяжкую, складаную, але цікавую работу заолагаў, даследчыкаў унікальных куточкаў нашай краіны.

Чацвёртакурснікі цікава расказвалі аб палявых практыках, якія яны праходзілі ва ўрочышчы Чонкі, у вёсцы Гагалі, рыбгасе «Трэмля», аб рабоце членаў навукова-вытворчага атрада «Запаведнік» у Лапландскім дзяржаўным запаведніку на Кольскім паўвостраве. Госць вечара, выпускнік біяфака В. Прадкін, які цяпер працуе ў Капетдагскім дзяржаўным запаведніку, расказаў аб нялёгкай рабоце егера, аб будаўніцтве ў нашай краіне вальера для ўтрымання куланаў з мэтай іх рэакліматызацыі. Ён жа расказаў удзельнікам вечара аб першай беларускай экспедыцыі па праблеме пошукаў снежнага чалавека на Паміры, паказаў цікавыя слайды, якія адлюстроўваюць багацце і прыгажосць нашай Радзімы.

У рамках дзён кафедры члены заалагічнага гуртка правялі сустрэчу студэнтаў з удзельнікамі зімовай комплекснай экспедыцыі ВНВА «Фауна Палесся», якая праходзіла ў студзені бягучага года ў Рэчыцкім раёне. У час гэтай сустрэчы студэнты малодшых курсаў пазнаёміліся з работай заолагаў у зімовых умовах, з сабранымі імі матэрыяламі.

Закончыліся дні кафедры заалогіі і аховы прыроды спартыўнымі спаборніцтвамі па футболу і валейболу. У іх прынялі ўдзел чатыры каманды. Каманду выкладчыкаў прадстаўлялі аспіранты, супраць іх гулялі студэнты, якія праходзяць спецыялізацыю на розных кафедрах біяфака. Гульня ў футбол прынесла перамогу камандзе аспірантаў на чале з капітанам Г. Ганчарэнкам.

Вельмі напружана праходзілі гульні паміж камандамі кафедр батанікі і фізіялогіі раслін і заалогіі і аховы прыроды, якія аспрэчвалі другое месца. Перамагла каманда кафедры заалогіі і аховы прыроды.

Ва ўпартай барацьбе праходзілі таксама спаборніцтвы па валейболу. Перамаглі аспіранты.

Уручыў прызы пераможцам загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды, прафесар Б. П. Савіцкі, які сказаў, што кожная сустрэча — гэта крок да дружбы, якая так неабходна ў студэнцкія гады.

**А. КУСЯНКОЎ, куратар біялагічнага факультэта ў інтэрнаце № 4.**

У НАРОДНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ МАРАЛЬНА- ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

## ПЕРАМАГЛА ДРУЖБА

барчая акруга, г. [illegible]

Вярхоўны Саве[illegible]
джае наступны па[illegible]
сесіі:

1. Выбранне Ма[illegible]
сіі Вярхоўнага [illegible]
арускай ССР.

2. Выбранне [illegible]
Вярхоўнага Савета [illegible]

За вокнамі было пахмурнае надвор'е, а ў аўдыторыі, дзе праходзіў конкурс «Ану, дзяўчаты!», нібы свяціла яркае веснавое сонейка. Так цёпла тут было ад усмешак, прыўзнятага настрою саміх удзельніц конкурсу, іх гасцей — балельшчыкаў — слухачоў факультэта педагагічнай этыкі народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання, выкладчыкаў, куратараў біялагічнага факультэта.

Святочнасць і прыўзнятасць надавала ўсім прыгожа ўбраная аўдыторыя з малюнкамі другакурсніцы біяфака Святланы Скрынічэнка, рэпрадукцыямі карцін рускіх і савецкіх мастакоў.

Тры каманды другога курса выйшлі паспаборнічаць паміж сабой — «Адуванчык» (група Б-21), «Малышка» (гр. Б-22) і «Рытм» (гр. Б-23). Іх прадстаўлялі адпаведна Ірына Кацуба, Ніна Бяляева, Аня Шагурава; Алена Аўдашова, Таццяна Ермакова, Лілія Рэут; Алена Пракапенка, Раіса Халадзіліна і Святлана Чарток. Вяла праграму конкурсу Святлана Нікалаева, ацэньвала вартасці яго ўдзельніц журы ў саставе Т. Пашукевіч, А. Вялькова і Ж. Аляксеенка.

Першыя пытанні конкурсу «Ану, дзяўчаты!» выявілі веды ўдзельніц каманд па заалогіі, па гісторыі роднага горада і інш.

Паспяхова справіліся дзяўчаты з дамашнім заданнем, у якое ўваходзілі падрыхтоўка арыгінальнага нумару і кулінарныя здольнасці — уменне прыгатаваць прыгожы і смачны торт. Журы высока ацаніла гэтае заданне.

Вельмі цёпла прымалі і самі ўдзельніцы конкурсу, і іх балельшчыкі выступленні Таццяны Вараб'ёвай у час невялікіх перапынкаў паміж конкурсамі. Дзяўчына выконвала пад акампанемент гітары песні.

У той вечар не было пераможцаў і пераможаных. Перамаглі дружба, шчырасць, дабрата і маладосць!

**Т. КАРНІЙКА, студэнтка 2-га курса біялагічнага факультэта.**

## КАНЦЭРТ МАСКОЎСКІХ АРТЫСТАЎ

Частымі і жаданымі гасцямі нашага універсітэта сталі прафесіянальныя артысты. На гэты раз у мінулую сераду на сцэне актавай залы выступілі лаўрэаты Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады саліст Юлій Слабодкін і гітарыст Яўген Марчанка з «Масканцэрта». У іх выкананні прагучалі папулярныя песні на словы і музыку вядомых савецкіх паэтаў і кампазітараў.

Выступленне маскоўскіх артыстаў было цёпла прынята шматлікімі гледачамі.

